**Л. В. Мікалаева,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт
*установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі"*
*г. Мінск*

# ЭТНІЧНАЯ ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У X — XIII СТСТ.

Перш, чым перайсці да зместу матэрыялу, патлумачым важнейшыя дэфініцыі, якімі будзем апераваць у тэксце: этнас, народнасць, нацыя.

***Этнас*** (ад грэч. *ethnos* — племя, народ) — устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі, мае агульную мову, культуру, побыт, псіхалагічныя рысы і самасвядомасць [1, с. 14].

Вельмі шмат для вызначэння паняцця "этнас" было зроблена вядомым савецкім этнографам Ю. В. Брамлеем, які адным з важнейшых крытэрыяў існавання асобнага этнасу лічыў этнічную самасвядомасць [2, с. 97 — 98]. Даследчык прапаноўваў "…размяжоўваць "этнічныя" і "этнаграфічныя" агульнасці перш за ўсё на падставе такога паказчыка, як наяўнасць альбо адсутнасць этнічнай самасвядомасці"[2, с. 126].

У савецкай школе этнаграфіі была прапанавана тыпалогія этнасаў, у якой вылучаліся наступныя формы: род, племя, народнасць, нацыя. Звернем увагу на два апошнія паняцці. ***Народнасць*** — гэта гістарычна сфарміраваная супольнасць людзей (этнічная супольнасць), для якой характэрна адзіная мова, тэрыторыя, пануючы эканамічны лад (натуральная гаспадарка), этнічная самасвядомасць, псіхічны склад і культура [1, с. 97]. Асноўнымі прыкметамі народнасці з'яўляюцца: адносная агульнасць мовы, тэрыторыі, культуры, пэўныя гаспадарчыя сувязі, этнічная самасвядомасць і саманазва. ***Нацыя*** (ад лац. *natio* — племя, народ) — гістарычная супольнасць людзей, якая характарызуецца ўстойлівымі эканамічнымі і тэрытарыяльнымі сувязямі, агульнасцю мовы, культуры, характару, побыту, традыцый, звычаяў, самасвядомасці. Нацыі ўзнікаюць на базе феадальных народнасцей у перыяд станаўлення капіталістычнага спосабу вытворчасці [1, с. 275].

Параўноўваючы гэтыя вызначэнні можна вылучыць блок т.зв. "аб'ектыўных" прыкмет, якія могуць быць уласцівы супольнасцям і на стадыі народнасці, і на стадыі нацыі: адметная мова, рэлігія, агульная тэрыторыя, рысы матэрыяльнай культуры, дзяржаўныя структуры і г.д. Такім чынам, фактарам, які ўплывае на пераўтварэнне народнасцей у нацыі можна назваць культурна-гістарычны кантэкст, які спрыяе вылучэнню тых ці іншых прыкмет этнічнай супольнасці і рыс яе эканамічнага жыцця, складванню элементаў культуры і свядомасці яе носьбітаў. Пры гэтым самі "аб'ектыўныя" прыкметы на розных стадыях атрымліваюць ужо рознае вымярэнне.

Бібліятэка БДУІР

Звяртаючыся непасрэдна да нашай тэмы, неабходна адзначыць, што станаўленне беларускага этнасу сваімі каранямі сягае ў дапісьмовую гісторыю Беларусі. Рассяленне балтаў на тэрыторыі, дзе пражывала фіна-ўгорскае насельніцтва, а затым і прыход славян у значнай ступені вырашылі далейшы кірунак эвалюцыі мясцовага грамадства [3, с. 5 — 9].

Храналагічны пачатак разгляду нашай тэмы варта аднесці да X ст. па шэрагу прычын. Па-першае, рассяленне славян на тэрыторыі сучаснай Беларусі сярод балцкага насельніцтва, што пачалося ў сярэдзіне I тыс. н.э., да X ст. дасягнула паўночных рэгіёнаў сучаснай беларускай тэрыторыі. Па-другое, большасць даследчыкаў менавіта з X ст. звязваюць мяжу ў асіміляцыйных працэсах, якімі суправаджалася рассяленне славян, калі адбываецца змена этнічнай прыналежнасці насельніцтва беларускіх зямель. У X ст. славяне становяцца асноўным насельніцтвам краю.

У выніку славяна-балцкага сінтэзу ў IX — X стст. у Верхнім Паддзвінні і Падняпроўі сфарміраваліся новыя ўсходнеславянскія этнічныя супольнасці (пранароднасці, протанароднасці) крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў, назвы якіх патрапілі і на старонкі пісьмовых крыніц. У культуры і мове гэтых супольнасцей перапляліся славянскія і балцкія элементы. Гэта былі якасна новыя ўтварэнні, у якіх пераважалі славянскія рысы і якія займалі своеасаблівае месца сярод іншых усходнеславянскіх этнасаў.

Рассяленне славян мела вялікае прагрэсіўнае значэне для гістарычнага лёсу Беларусі. Яно садзейнічала знікненню існаваўшых да гэтага інстытутаў родаплемяннога ладу, паскарала развіццё шматукладнага грамадства [4, с. 324 — 325].

У наш час некаторыя даследчыкі спрабуюць адносіць пачатак фазы фарміравання беларускай народнасці да X — XII стст. Каб вызначыць слушнасць такіх падыходаў, неабходна знайсці адказ на пытанне аб этнічнай самаідэнтыфікацыі насельніцтва беларускіх зямель у X — XIII стст. Бо калі не існавала адметнай этнічнай самасвядомасці, казаць пра існаванне беларускай народнасці ў той перыяд не выпадае.

Непасрэдна звязана з гэтым пытаннем і праблема існавання старажытнарускай народнасці і ўваходжаннем тагачаснага насельніцтва беларускіх зямель у яе склад. Яшчэ ў 1950-я гг. у савецкай гістарыяграфіі склалася тэорыя, якая сцвярджала пра ўтварэнне ўсходнімі славянамі ў раннефеадальны перыяд “этнічнай супольнасці новага тыпу” [5, с. 218] — старажытнарускай народнасці. Асноўнымі крытэрыямі яе называлі агульнасць тэрыторыі (у межах Кіеўскай Русі), гаспадарчага жыцця, мовы, матэрыяльнай і духоўнай культуры, наяўнасць агульнага этноніма “Русь”. Як бачым, пра самасвядомасць у пераліку прыкмет старажытнарускай народнасці гаворка не ішла.

У наш час даледчыкі актыўна ставяць пад сумненне сам факт існавання старажытнарускай народнасці, абвяргаючы складванне яе “аб’ектыўных” прыкмет [4, с. 328].

Што датычыць полісемантычнага тэрміна “Русь”, то яшчэ ў XIX ст. знакаміты расійскі гісторык В. Ключэўскі вылучыў чатыры яго значэнні: “1)

Бібліятэка БГУІР

этнаграфічнае: русь — племя, 2) сацыяльнае: русь — саслоўе, 3) геаграфічнае: Русь — вобласць, 4) палітычнае: Русь — дзяржаўная тэрыторыя” [6, с. 94].

Гэты тэрмін мае скандынаўскае паходжанне і першапачаткова (у IX – большай частцы X ст.) ужываўся для пазначэння дынастыі Рурыкавічаў і іх дружыны, пасля перанясення сталіцы з Ноўгарада ў Кіеў трывала замацаваўся за тэрыторыяй Сярэдняга Падняпроўя [7, с. 145 — 146]. Гэта была “Руская зямля” ў *вузкім* сэнсе, як тэрытарыяльны і палітычны цэнтр Кіеўскай дзяржавы.

Даследчыкі высветлілі, што ўжыванне тэрміна “Русь” у этнічным сэнсе да ўсіх усходніх славян у IX — сярэдзіне XII ст. не пацвярджаецца аўтэнтычнымі пісьмовымі крыніцамі. Аднак існавала паняцце Русі і Рускай зямлі ў *шырокім* сэнсе. Але з кантэксту крыніц відаць, што ўжывалася яно заўсёды ў якасці *канфесіоніма* (прыналежнасць да Рускай, г.зн. Кіеўскай мітраполіі) і *палітоніма* (дзяржаўна-генеалагічная агульнасць, створаная Рурыкавічамі). У *самым шырокім сэнсе* тэрмін “Русь” быў сінанімічным паняццю “праваслаўны свет” і выкарыстоўваўся ўсходнеславянскімі асветнікамі ў дачыненні не толькі ўсходніх славян, але і да іншых этнасаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Даследчыкі высветлілі, што тэрмін “Русь” у дачыненні да насельніцтва беларускіх зямель першапачаткова з’яўляўся этнасацыонімам і азначаў прыналежнасць да роду Рурыкавічаў, дружыны, купецтва. Распаўсюджванне хрысціянства прывяло да ўзнікнення новай этнаканфесійнай ідэнтычнасці ва ўсходнеславянскім рэгіёне. З’яўленне Кіеўскай мітраполіі і хрышчэнне ў “рускую” веру спрыяла невіліроўцы былых племянных этнічных адметнасцяў. Тэрміны “рускі” і “хрысціянін” з цягам часу сталі ўзаемазамяняльнымі словамі-сінонімамі. Пісьмовыя крыніцы, створаныя на тэрыторыі Беларусі ў канцы XII ст., дазваляюць казаць аб паступовым засваенні новай сістэмы этнаканфесійнай самаідэнтычнасці насельніцтвам гарадоў[8, с. 3 — 7]. Калі казаць аб свядомасці асноўнай масы вясковага насельніцтва, то, верагодна, можна сцвярджаць пра захаванне імі да сярэдзіны XII ст. самаідэнтыфікацыі, уласцівай летапісным крывічам, дрыгавічам і радзімічам, аб чым пераканаўча сведчаць асаблівасці пахавальнага абраду і пісьмовыя крыніцы [9, с. 44 — 45; 10, с. 62 — 104].

Такім чынам, у цэлым можна казаць аб складванні ў асяроддзі эліты таго часу параметраў новай калектыўнай ідэнтычнасці, характэрнай для усіх зямель Кіеўскай Русі. Відавочнай з’яўляецца і аднароднасць гарадской матэрыяльнай і духоўнай культуры на ўсёй усходнеславянскай тэрыторыі (за выключэннем мовы). Гэтыя факты у пэўнай ступені можна выкарыстоўваць як тэзісы ў падтрымку сцвярджэння аб пачатку абагульняючых этнічных працэсаў у рэгіёне, якія ўсё ж не былі завершаны [4, с. 328]. Па меншай меры казаць пра існаванне агульнай этнічнай свядомасці асноўнай масы насельніцтва Кіеўскай Русі, 90% якого складалі сяляне, не выпадае. У сувязі з гэтым даволі лагічна выглядае гіпотэза аб тым, што старажытнаруская

Библиотека БГУИР

этнічная агульнасць (народнасць) існавала толькі на ўзроўні носьбітаў элітарнай культуры і слаба ўспрымалася радавым насельніцтвам [11, с. 37].

Рэзюмуючы можна казаць, што насельніцтва першых раннефеадальных княстваў (Полацкага, Тураўскага) яшчэ не кансалідавалася ў агульны беларускі этнас, аб чым сведчыць адсутнасць у тагачасных насельнікаў беларускіх зямель устойлівай этнічнай самасвядомасці. Адносна існавання стражытнарускай народнасці можна адзначыць пачатак абагульняльных этнічных працэсаў у рэгіёне, якія не былі цалкам завершаны. Разам з тым нельга адмаўляць уплыву на фарміраванне беларускай культурнай традыцыі спадчыны перыяду Кіеўскай Русі. Яны відавочныя і ў “высокай” матэрыяльнай культуры гарадоў, і ў складванні дзяржаўнапалітычных і сацыяльнакультурных узораў, аднолькавых для ўсіх княстваў. Няма ніякіх падстаў казаць пра поўную палітычную незалежнасць ці ізаляванасць Полацка, а тым больш Турава ад Кіева.

Аднак развіццё грамадства не стаяла на месцы. XII ст. азнаменавалася пачаткам феадальнай раздробленасці, што прывяла да з’яўлення на беларускіх землях каля 20 новых княстваў. Вынікам іх развіцця стала надзвычай стракатая этнакультурная карта Беларусі другой паловы XII — XIII стст., прадстаўленая шмалікімі раннедзяржаўнымі зямляцкімі супольнасцямі (палачанамі, віцябчанамі, берасцянамі і інш.). Адной з прычын іх узнікнення даследчыкі лічаць асаблівасць тагачаснага дзяржаўнага ладу ва ўсходніх славян: сацыяльны пласт феадалаў толькі знаходзіўся на стадыі фарміравання, і значную ролю адыгрывалі гарады, якія мелі веча і ўласнае апалчэнне. Сталіцы ўдзельных княстваў выконвалі настолькі важную адміністрацыйную, гаспадарчую і культурную ролю ў паўсядзённым жыцці навакольнага насельніцтва, што яны пачалі ўспрымацца ў іх у якасці тэрытарыяльных і этнасацыяльных дамінантаў, што і прывяло неўзабаве да з’яўлення асобных зямляцтваў (лакальных згуртаванняў насельніцтва пэўных тэрыторый) [12, с. 542 — 543].

Адбываліся паступовыя змены і ў ментальнасці насельніцтва беларускіх зямель, аб чым сведчыць пахавальны абрад. Дадзеныя археалагічных даследаваняў дазваляюць вызначыць, што ў сярэдзіне XII — першай палове XIII стст. у Верхнім Падняпроўі і Падзвінні, а таксама на тэрыторыі Тураўскага княства ў вясковым асяроддзі распаўсюдзіліся пахаванні паводле абраду трупапалажэння ў падкурганнай яме [13, с. 202, 219, 222; 10, с. 62 — 67; 14, с. 24 — 26]. Паказальна і тое, што менавіта ў сярэдзіне XII ст. “памірае” і племянная этнічная самаідэнтыфікацыя, са старонак летапісаў знікаюць згадкі пра крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. На змену ім трывала прыходзіць этнаканфесіонім “Русь”. На думку М. Ф. Піліпенкі, паміж перыядам панавання зямляцтваў і часам узнікнення народнасці існаваў яшчэ і прамежкавы этап. Згодна з яго меркаваннем, моцнае культурнае ўздзеянне Полацка і Турава прывяло да складвання адпаведных лакальных этнічных груп, а менавіта — *палешукоў* у басейне р. Прыпяць (былыя дрыгавічы і драўляне) і *беларусцаў* у падзвінска-дняпроўскім рэгіёне (былыя крывічы). Іх наступная кансалідацыя адбывалася дзякуючы хуткаму развіццю заходняга і

Библиотека БГУИР

цэнтральнага рэгіёнаў Беларусі (спачатку Наваградак — Гродна — Ваўкавыск — Слонім, а пазней яшчэ і Менск — Магілёў), якія ў XIII — XIV стст. сталі дамінаваць у мясцовым палітычным і гаспадарчым жыцці. Якраз насельніцтва рэтага абшару, па меркаванні М. Ф. Піліпенкі, і можна лічыць "першай беларускай рэгіянальнай культурай", бо яно не толькі здолела пераняць і ўспрыняць лепшыя здабыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры палешукоў і беларусцаў, але і стала паміж імі трывалым пасрэднікам, што прывяло, урэшце, да іх узаемазліцця ў адзіны этнас [15, с. 72 — 90].

Разам з тым масавая хрысціянізацыя ўсходнеславянскіх зямель па праваслаўнаму "рускаму" ўзору каталізавала працэсы моўнай і культурнай асіміляцыі абарыгеннага даславянскага насельніцтва. Гэта акалічнасць у сваю чаргу павялічвала ролю субстратнага ўплыву, што і спрыяла фарміраванню будучых "аб'ектыўных" этнаграфічных прыкмет сучасных усходнеславянскіх народаў. Менавіта хрысціянізацыя і ўзнікшая на яе базе канфесійная самаідэнтыфікацыя замацавалі ў якасці саманазвы насельніцтва беларускіх зямель этнаканфесіонім "Русь". З пачатку XIII ст. ён пастаянна сустракаецца ў крыніцах, створаных на тэрыторыі Полацкай і Смаленскай зямлі [16, с. 69; 17, с. 35].

У цэлым у дачыненні да этнічнай супольнасці, якая склалася на землях сучаснай Беларусі да XIII ст., баларускі даследчык І. Марзалюк прапануе вызначэнне "этнаканфесійны народ". Падобныя супольнасці (этнаканфесійныя агульнасці) характарызуюцца як адметны тып сацыяльнай агульнасці з рэлігійна аформленым жыццёвым укладам і этнічнай самасвядомасцю, якая выступае як рэлігійная. Палітычныя, часткова геаграфічныя і эканамічныя прычыны, паглыбленыя іншаэтнічным атачэннем, паступова пераўтваралі яго ў вядучы этнаўтвараючы фактар[18, с. 33].

Неабходна адзначыць, што праблема далейшай кансалідацыі насельніцтва беларускіх зямель у адзіны этнас застаецца дыскусійнай і ў наш час. Агульнапрынятая канцэпцыя адзначае, што гэта стала магчымы толькі дзякуючы ўтварэнню Вялікага Княства Літоўскага [12, с. 543]. Такім чынам, умовы для фарміравання беларускай народнасці склаліся толькі з сярэдзіны XIII ст.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам./ Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. — Мінск : Вышэйшая школа, 2009. — 512 с.

2. Бромлей, Ю. В. Этнос и этнография/ Ю. В. Бромлей. — М. : Наука, 1973. — 283 с.

3. Заяц, Ю. Паходжанне беларусаў/ Ю. Заяц// Матэрыялы па гісторыі Беларусі. — Мінск : НІА, 1998. — 222 с.

Библиотека БГУИР

4. Гісторыя Беларусі: У 6 т. — Мінск : “Экаперспектыва”, 2007. — Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. — 351 с.

5. Загарульскі, Э. М. Заходняя Русь. IX – XIII стст.: вучэб. дап./ Э. М. Загарульскі. — Мінск : “Універсітэцкае”, 1998. — 240 с.

6. Ключевский, В. О. Сочинения в 9 т./ В. О. Ключевский. — М. : “Мысль”, 1989. — Т. 4. — 398 с.

7. Насевіч, В. Русь/ В. Насевіч// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. — Мінск : БелЭН, 2006. — Т. 6. — Кн. 1. — 591 с.

8. Багдановіч, А. Б. Да пытання аб канфесійным кампаненце ў вызначэнні этнічнай самасвядомасці ўсходнеславянскага насельніцтва Беларусі перыяду сярэдневякоўя/ А. Б. Багдановіч// Веснік БДУ. — Серыя 3. — 1998. — № 3.

9. Лысенко, Ф. П. Дреговичи/ Ф. П. Лысенко. — Минск : “Навука і тэхніка”, 1991. — 242 с.

10. Штыхаў, Г. В. Крывічы/ Г. В. Штыхаў. — Минск : “Навука і тэхніка”, 1992. — 191 с.

11. Иванченко, Л., Моця, А. И так разошелся славянский народ…/ Л. Иванченко, А. Моця// Родина. — 2002. — № 11 — 12.

12. Гісторыя Беларусі: У 6 т. — Мінск : “Экаперспектыва”, 2008. — Т.2. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. — 688 с.

13. Седов, В. В. Археология СССР. Восточные славяне в VI — XIII вв./ В. В. Седов. — М. : Наука, 1982. — 328 с.

14. Богомольников, В. В. Курганы радимичей/ В. В. Богомольников// Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1994. — № 4.

15. Пилипенко, М Ф. Возникновение Белоруссии. Новая концепция/ М. Ф. Пилипенко. — Минск : Беларусь,1991. — 142 с.

16. Памятники русского права/ Сост. А. А. Зимин; под ред. С. В. Юшкова. — М. : Государственное издательство юридической литературы, 1953. — Вып. 2. Памятники права феодально-раздробленной Руси. XII — XV вв. — 442 с.

17. Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв./ Сост. А. Л. Хорошкевич. — М. : Институт истории СССР, 1977. — Вып. I. — 228 с.

18. Марзалюк, І. А. Людзі даўняй Беларусі: Этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X — XVII стст.): Манаграфія/ І. А. Марзалюк. — Магілёў, МДУ імя А. А. Куляшова, 2002. — 324 с.

Библиотека БГУИР